

Дзвінскі ўзгорак

Кроч на свой родны,
дзвінскі ўзгорак,
каб глядзець у будучую сінь

ГРАМАДСКА-ПАЛІТЫЧНАЯ ГАЗЕТА ВІЦЕБСКАГА РАЁНА, №11 (98)
ЛІПЕНЬ 2019 ГОДА

ЗВАРОТ

25 ПІЛІГРЫМКА

Грэка-каталікі адсьвяткавалі ў Полацку 25-ю пілігрымку і напісалі ліст да Гулякі.

Нягледзячы на адмену 25-й пешай грэка-каталіцкай пілігрымкі ў гонар пяці манахаў-базылянаў, забітых расейцамі ў 1705 годзе ў полацкай Сафіі, некалькі вернікаў прайшлі ўсё ж такі шляхам пілігрымкі зь Віцебску да Полацку ў прыватным парадку — за 4 дні замест ранейшых пяці.

Як звычайны пешаход прайшоў крыжовы шлях віцебскі вернік-уніят і дысыдэнт Барыс Хамайда.

"Мною рухала адзіная інтэнцыя: я мусіў прайсьці гэты шлях за Беларусь. Дайду – усё будзе добра. Пілігрымка – гэта момант грамадзкай салідарнасьці. Дзяржава бачыць у пілігрымках працэс нацыянальнай кансалідацыі, а гэта самае страшэннае для яе. Да свабоды ж можна прыйсьці толькі праз веру, і пілігрымка ёсьць складнікам нашай веры. Яны гэта бачаць і баяцца", – сказаў Барыс Хамайда.

У знак салідарнасьці з уніятамі шлях зь Менску да Полацку рыма-каталік Мікола Арцюхоў прайшоў пешкі і праехаў аўтатранспартам – дабіраўся "аўтастопам".

"Я паважаю грэка-каталікоў. Іх, на жаль, прыціскаюць і недаацэньваюць і Рым, і народ. А гэта вельмі важная канфэсія для Беларусі, якая дала шмат пакутнікаў, шмат прыкладаў веры. І я ўсіх заклікаю слухацца свайго сэрца і жыць па сумленьні", – выказаўся Мікола.

Ушанаваньне полацкіх пакутнікаў і сьвятога Язафата, як заўжды пасьля пілігрымкі, адбылося ў нядзелю каля храму Параскевы Полацкай. Пілігрымы зьехаліся з усёй Беларусі. Сьвяточную літургію ўзначаліў апостальскі візытатар для грэка-каталікоў Беларусі Сяргей Гаек.

У сваім казаньні гарадзенскі сьвятар Андрэй Крот адзначыў, што ў гэты дзень уніяты ўшаноўваюць памяць ня толькі полацкіх пакутнікаў і сьвятога Язафата, дзейнасьць якога распасьціралася на ўсе беларускія землі, але і новамучанікаў, якія пацярпелі ў XX-м стагодзьдзі – Мар'яны Бернадзкай, Фабіяна Абрантовіча, Антона Неманцэвіча ды іншых.

Выказаўся сьвятар і адносна забароны штогадовай пілігрымкі. Сказаў, што ня хоча нікога асуджаць і што кожная вестка для хрысьціяніна мусіць стаць рахункам сумленьня.

"Пілігрымка была 24 гады, а сёлета яе ня стала, дык давайце задамо пытаньне: а што мы робім для гэтай пілігрымкі? Я памятаю, што ў першай пілігрымцы ўдзельнічалі 23 чалавекі. Памятаю часы, калі было 150 чалавек, але ў апошнія гады – па 40-60. Чаму? Часы зьмяняюцца, і не заўжды ў лепшы бок. Дык калі шукаць нашую асабістую віну, то мы прызвычаіліся да камфорту. Разважаючы пра пакутнікаў, давайце памятаць, што мучанікамі не станавіліся раптоўна. Мучаніцтва было плёнам жыцьця хрысьціяніна з Богам", – падкрэсьліў айцец Андрэй Крот.

Віцебскі сьвятар Зьміцер Грышан, у сваю чаргу, выказаў упэўненасьць, што 26-я пілігрымка, налета абавязкова адбудзецца, і рыхтавацца да яе трэба ўжо сёньня – і ў думках, і ў малітве.

Пры канцы сьвяточнай літургіі сьвятар Аляксандар Шаўцоў зачытаў зварот грэка-каталікоў да ўпаўнаважанага па справах рэлігіяў і нацыянальнасьцяў Леаніда Гулякі. Вернікі засяроджваюць увагу на тым, што праблема зь пілігрымкай паўстала праз пастанову Савету Міністраў №49 ("Аб зацьвярджэньні палажэньня аб парадку аплаты паслугаў па ахове грамадзкага парадку").

Практыка, зьвязаная з гэтым нарматыўным актам, выклікала сумненьні ў магчымасьцях рэалізацыі права на свабоду веравызнаньня, бо правядзеньне пілігрымак і працэсіяў належыць да істотных рэлігійных практык. Працэс узгадненьня сёлетняй пілігрымкі паказаў, што ў пастанове маецца вузкае трактаваньне тэрміну "месцы пілігрымак", бо кожная пілігрымка прадугледжвае перамяшчэньне па акрэсьленым маршруце. Тэрмін мусіць распаўсюджвацца на ўвесь узгоднены маршрут і на час правядзеньня пілігрымкі.

"Вернік не павінен плаціць дзяржаве за магчымасьць ажыцьцяўляць свае рэлігійныя патрэбы", – гаворыцца ў звароце.

Па сканчэньні літургіі вернікі і сьвятары паставілі свае подпісы пад зваротам. Збор подпісаў працягнецца і пасьля пілігрымкі.

Ян Сведка

Чытайце сайт Віцебскага раёна:
http://vicebskreg.by

ГРАМАДСТВА І ЎЛАДА

УЛАДЫ АДМОВІЛІСЯ

Віцебскія актывісты грамадзкага аб'яднаньня "Альтэрнатыва" сабралі каля 1000 подпісаў пад зваротам у Віцебскі гарвыканкам з прапановай разьмясьціць у цэнтры гораду шыльдачкі з гістарычнымі назвамі вуліцаў. Нядаўна атрымалі адказ. Улады пішуць, што нанясеньне гістарычных назваў "можа прынесьці пэўныя нязручнасьці для жыхароў і гасьцей гораду…"

Прапанова ўсталяваць шыльды зь пералікам гістарычных назваў тычылася 14-ці цэнтральных вуліцаў Віцебску – Леніна, Суворава, Талстога, Камсамольскай, Рэвалюцыйнай, Кастрычніцкай, Пушкіна, Путна, камісара Крылова, Энгельса, Урыцкага, Савецкай, Кірава, Шубіна, праспэкту Фрунзэ, а таксама плошчы Леніна.

Ініцыятары прапановы абапіраліся на досьвед іншых беларускіх гарадоў, напрыклад Менску, Горадні, Баранавічаў, Пружанаў ды іншых. На думку актывістаў, усталяваньне шыльдаў са спрадвечнымі назвамі вуліцаў дапаможа захаваць Віцебску сваё гістарычнае аблічча, падкрэсьліць сваё мінулае ды прывабіць турыстаў.

Не атрымалася.

"Гораду Віцебску ў гэтым годзе спаўняецца 1045 гадоў, падчас якіх гарадзкія вуліцы неаднаразова зьмянялі свае назвы. Нанясеньне ўсіх гістарычных назваў вуліц на аншлягі ня будзе садзейнічаць падтрыманьню адзінай канцэпцыі афармленьня гістарычнай часткі гораду, зможа прынесьці пэўныя нязручнасьці для жыхароў і гасьцей гораду", – піша ў адказе актывістам "Альтэрнатывы" намесьнік старшыні Віцебскага гарвыканкаму Віктар Глушын.

Якія нязручнасьці гэта можа прынесьці віцяблянам і гасьцям гораду, чыноўнік не ўдакладняе.

Затое спасылаецца на тое, што выраб і ўстаноўка аншлягаў пацягне за сабой значныя фінансавыя выдаткі.

Стваральнік "Альтэрнатывы" Алег Корбан, камэнтуючы ў сацсетках адказ гарвыканкаму на калектыўны зварот, піша, што такія адпіскі чыноўнікі хай пакінуць сабе.

"Мы ж падкрэсьлівалі ў звароце, што, калі няма грошай у вашым бюджэце, – не праблема, назавіце суму для вырабу шыльдачак, мы хутка назьбіраем. Дык не, высокія чыны гэтага не разумеюць, і ня хочуць разумець… А гэтае рашэньне будзем абскарджваць, такія адпіскі хай пакінуць сабе", – напісаў Алег Корбан.

Між тым, намесьнік старшыні гарвыканкаму Віктар Глушын абяцае ў адказе, што "прапанова аб усталяваньні шыльдаў зь гістарычнымі назвамі вуліцаў прынятая да ўвагі і будзе ўлічаная ў працы".

Зьміцер Міраш
«Віцебская вясна»

СОЦЫЮМ

У ЧЫМ СПРАВА?..

Сёлета колішняя сядзіба батаніка Ўладзімера Адамава ў Вялікіх Лётцах перайшла ва ўласнасьць прадпрымальніка Максіма Жукава. Культурны дзеяч зь Віцебску ператварае сядзібу ў культурны цэнтар, але, як высьвятляецца, ня ўсім падабаецца яго актыўная дзейнасьць

18 ліпеня ў фэйсбуку Максім Жукаў паведаміў, што нехта зь мясцовых жыхароў паскардзіўся на яго ў міліцыю і падатковую інспэкцыю.

Як патлумачыў "Віцебскай вясьне" прадпрымальнік, першым было тэлефанаваньне зь міліцыі. Яму паведамілі, што аўтары ліста скардзяцца на масавыя мерапрыемствы, якія Жукаў ладзіць нібыта незаконна. Між тым, у міліцыі добра ведаюць, што імпрэзы на сядзібе праводзяцца згодна з заканадаўствам. Самі міліцыянты бяруць у іх удзел, выконваючы функцыі па ахове парадку.

Пазьней патэлефанавалі з падатковай інспэкцыі, куды таксама была дасланая скарга. Сустракацца з прадстаўнікамі інспэкцыі Максім Жукаў адмовіўся, бо ў сваёй дзейнасьці не выходзіць за межы, прапісаныя ў статуце, які прадпрымальнік яшчэ на пачатку сваёй дзейнасьці перадаў у падатковую.

Максім Жукаў мяркуе, што скардзіліся на яго тыя людзі, чые сараі апынуліся на ягонай зямлі. Сараі пабудаваныя незаконна і ня маюць належнай дакумэнтацыі. Да таго ж – знаходзяцца ў прыродаахоўнай зоне.

Тры месяцы новы гаспадар намагаецца, каб незаконныя пабудовы былі зьнесеныя, але справа зь месца ня рухаецца. Каб вырашыць праблему, Максім Жукаў зьвяртаўся ў сельсавет, райвыканкам і аблвыканкам, але атрымаў адпіскі. На гэтым тыдні зьвярнуўся ў пракуратуру са скаргай на бязьдзейнасьць службовых асобаў у вырашэньні гэтага пытаньня.

"Атрымліваецца, што адміністрацыя Віцебскага раёну сваёй бязьдзейнасьцю стварае напружанасьць паміж мной, уласьнікам, і жыхарамі вёскі. Калі б райвыканкам ці сельсавет, як тое мае быць паводле заканадаўства, выпісаў прадпісаньне на знос незаконных пабудоваў, то ўсе прэтэнзіі былі б не да мяне, а да органаў улады. Сытуацыя непрыемная тым, што адцягвае ўвагу, адбірае час ад асноўнай працы", – падсумоўвае Максім Жукаў.

Тым ня менш, 20 ліпеня ў Вялікіх Лётцах пройдзе чарговае культурніцкае мерапрыемства – "Батанік пацi", на якім выступяць гісторык Аркадзь Падліпскі, а таксама віцебскія музыкі Міхаіл Рубін, Эдзік Юдовін і "Восьмыдзень".

Якаў Дрозд

КУЛЬТУРА

«BOTANIC PARTY» Ў ВІЦЕБСКІМ РАЁНЕ

Віцебскі прадпрымальнік Максім Жукаў марыць зрабіць у вёсцы Вялікія Лётцы сапраўдны культурніцкі цэнтр для вяскоўцаў і гараджан. З гэтай мэтай ён упарадкоўвае закінуты будынак колішняй сядзібы знакамітага батаніка Уладзіміра Адамава і праводзіць там фэсты.

«Botanic Party» — гэта ўжо другая імпрэза, якая адбылася на тэрыторыі сядзібы.

Апрача канцэрту запрошаных музыкаў, ахвотныя маглі пасадзіць расліны ў памяць пра дзейнасць вядомага навукоўцы і паслухаць лекцыю краязнаўцы Аркадзя Падліпскага. На ягоную думку, Уладзімір Адамаў — выбітны вучоны, і ягонае імя можа стаць «фішкай» гэтых мясцін:

— Недзе ў канцы 19-гастагоддзя Уладзімір Адамаў пасадзіў на тэрыторыі сваёй сядзібы шыкоўны сад у Вялікіх Лётцах. І ён быў настолькі вядомы, што нават пасля Вялікай Айчыннай вайны сюды прыходзілі лісты з батанічных садоў усяго свету з прапановамі абмяняцца саджанцамі.

І да сёння ў вёсцы можна ўбачыць экзатычныя расліны, пасаджаныя Адамавым. Але сад прыйшоў у заняпад, калі ягоны гаспадар мусіў з'ехаць адсюль неўзабаве пасля прыходу савецкай улады.

Прадпрымальнік Максім Жукаў спадзяецца, што культурніцкая пляцоўка — адроджаная сядзіба Адамава — прыцягне сюды турыстаў і зробіць жыццё вяскоўцаў цікавейшым:

— Летась тут зачынілі і школу, і дзіцячы дом — апошнія рэштк
і культуры знішчаюцца. Атрымліваецца, сядзіба Адамава стала новай культурніцкай пляцоўкай, і для мясцовых жыхароў, і для віцяблян. Тым болей, для жыхароў Вялікіх Лётцаў на ўсе мерапрыемствы ўваход свабодны.

Здавалася б, ініцыятыва новага гаспадара мусіла б быць шырока падтрыманай. Але некалькі вяскоўцаў незадаволены тым, што давядзецца зносіць пабудовы, самавольна ўзведзеныя на тэрыторыі сядзібы. А ўлады на дапамогу Максіму Жукаву не спяшаюцца. Прадпрымальнік мусіў звярнуцца ў пракуратуру, каб развязаць канфлікт і далей развіваць ідэю культурніцкага цэнтру.

«Радыё Рацыя»

ЗДАРЭННІ

ЛЕГКОВУШКА СТОЛКНУЛАСЬ С ЛОСЁМ

Витебским районным отделом Следственного комитета расследуется уголовное дело о ДТП в Витебском районе, в котором пассажир получил серьезные травмы.

Как сообщила БЕЛТА официальный представитель УСКпоВитебскойобластиОксана Лазько, по данным следствия, 21 июня 28-летний водитель легкового авто двигался по 105-у километру дороги М8 Граница России (Езерище)-Витебск-Гомель- граница Украины (Новая Гута). Около 23.00 машина стокнулась с лосем, перебегавшим проезжую часть.

В результате ДТП 15-летний пассажир автомобиля получил тяжкие телесные повреждения.

В отношении водителя возбуждено уголовное дело по ч.2 ст.317 УК (нарушение правил дорожного движения или эксплуатации транспортных средств лицом, управляющим транспортным средством, повлекшее по неосторожности причинение тяжкого телесного повреждения).

Водитель в момент аварии был трезв.

Для установления обстоятельств аварии следователи просят граждан, располагающих интересующей информацией, сообщить об этом по телефону оперативно-дежурной службы УСК по Витебской области 8 (033) 399-80-44 (круглосуточно).

«Белта»

ПРАДПРЫМАЛЬНІЦТВА

КЛЕВОЕ МЕСТО

В огромный рукотворный пруд в д. Лучиновка Витебского района индивидуальный предприниматель Александр Селиванов запустил 5,5 т карпа.

К водоему, образованному из двух широких каналов, которые со всех сторон обступают низменные болотистые участки, подъехать трудно. И только одна дорога ведет к пруду через «КПП» (так в шутку местные жители называют въездные ворота), где есть вагончик с дежурным кассиром, принимающим гостей. Два года назад Александр Селиванов оформил пруд Лучиновка в аренду. Этот факт без восторга восприняли жители и дачники, а также многочисленные рыбаки-любители, которые съезжались порыбачить на водоем со всей округи и Витебска и пользовались природными благами бесплатно. А теперь за путевку на рыбалку в один световой день приходится выкладывать 20 руб. За это время разрешается выловить 5 кг рыбы, в основном товарного карпа, а также трофейный экземпляр (в водоем запущено 5 карпов по 10 кг). Одному счастливцу уже удалось поймать крупную особь. За все, что добыто сверх нормы, приходится доплачивать по 5 руб. за кг.

Вначале ИП разрешил местным жителям бесплатно вылавливать до 2 кг рыбы. Но это лишь послужило поводом для недобросовестных людей добывать продукции в несколько раз больше. Добрый жест не был оценен по достоинству, и лавочку пришлось прикрыть.

Однако желание делать добро у Александра не пропало. Ежегодно он устраивает для людей с ограниченными возможностями соревнования по вылавливанию хищной рыбы на своем пруду. Вот и в мае на состязания съехались 20 юных любителей порыбачить со всей области. Самый крупный улов в 1 кг 100 г оказался у 11-летнего Кирилла Гнутова из Витебска. Хороший результат был и у 16-летнего полочанина Данилы Совенка. А главное – праздник объединил мальчишек, дал возможность пообщаться в неформальной обстановке.

– В свое время и я с друзьями рыбачил на пруду Лучиновка. Клев был, но попадались мелкие карасики да плотвичка. Все берега в траве по пояс, не могли да и боялись разводить костер, не знали, куда выбросить отходы. Ни беседок, ни туалета, горы мусора. И это отдых? Вот тогда всерьез задумался, а не взять ли пруд в аренду, чтобы навести здесь порядок? – откровенничает Александр.

Спустя пару лет картина изменилась. На берегу водоема появились три красивые бревенчатые беседки со столами, мангалом, заготовленными дровами для костра, есть коптильня, огромный казан. Обустроены контейнерная площадка для мусора, стоянка для временной парковки автомобилей, туалет. Есть лодка, на которой хозяин осматривает пруд, подкармливает рыбу. Даже в сырую, совсем не летнюю погоду на водоеме активно плещется рыба. Видимо, эта игра добычи как магнит притягивает рыбаков. Улов здесь гарантируют даже самым невезучим, обещает арендатор.

Племянники Александра Селиванова – Алексей и Андрей 10 и 12 лет, пока мы с ним беседовали, залезли в лодку и кружили возле берега. Им был нипочем ни дождик, ни ветер, лишь бы побыть на природе. Любит посещать «вотчину отца» и 4-летний Арсений.

– Видите вырытый рядом с берегом котлован? – обращает Александр мое внимание на незаконченные земляные работы возле берега. – Строю маточник для выращивания мальков карпа и другой рыбы. Вот тогда смогу удешевить путевки для рыбаков. А еще на 1,5 гектара низменного участка посажу голубику, все равно земля пустует.

В Лучиновке витебчанин Александр Селиванов не гость, собирается основательно осесть, развить и расширить семейное дело. Взял в аренду участок земли под строительство дома, оформил крестьянско-фермерское хозяйство. В поддержку ему и старший брат Сергей собирается рядом возвести дом. Как знать, может со временем Лучиновка станет родовым поместьем Селивановых!

Елена Башун
«Витебские вести»

ПАЦИЕНТ НАБРОСИЛСЯ НА ВРАЧЕЙ

В республиканской туберкулезной больнице «Сосновка» в Витебском районе пациент бегал по коридору с ножом и кричал: «Я сейчас покажу, как режут десантники», угрожая медикам и пациентам.

Инцидент произошел осенью 2018 года. 51-летний пациент больницы, уроженец Гомельской области, распивал спиртное в компании мужчин из соседней палаты (это медучреждение — нережимный объект, пациенты двух отделений имеют право покидать его территорию).

Затем двое мужчин поссорились, начали драться и ненароком опрокинули дорогостоящие вещи одного из пациентов. Тот возмутился. На крики сбежались медсестры и попросили драчунов выйти из палаты.

— Обвиняемый вернулся в свою палату, — восстанавливает хронологию событий старший помощник прокурора Витебского района Иван Стативко. — Взяв нож, лежавший на тумбочке соседа, он вышел в коридор. Там в этот момент четыре медсестры и врач обсуждали, как помочь больному, у которого резко поднялось давление (тому самому, чьи дорогие вещи пострадали в драке). Обвиняемый стал размахивать ножом перед лицами медработников и пациентов и громко кричать: «Сейчас я вам покажу, как режут десантники». Успел ударить по одежде одного из пациентов. В этот момент из палаты вышел владелец ножа. Он сумел скрутить обвиняемого, отобрать у него нож и успокоить.

К приезду милиции уроженец Гомельской области лежал на кровати, притворяясь спящим.

Мужчина признан виновным в умышленных действиях, грубо нарушающих общественный порядок и выражающих явное неуважение к обществу, сопровождающихся угрозой применения насилия, совершенных с применением предметов, используемых для причинения телесных повреждений. Свою вину он так и не признал.

Вердикт суда — 5 лет ограничения свободы без направления в исправительное учреждение открытого типа. Пока шло расследование, мужчина почти 4,5 месяца находился в СИЗО.

Tut.by

АБ'ЯВА

Каб атрымліваць кожны нумар газеты "Дзвінскі Узгорак" паведаміце рэдакцыі аб гэтым. Калі не жадаеце атрымліваць газету, то патэдэфануйце.

Калі парушаны вашы правы спажыўца, працаўніка, то даем эфектыўныя парады па абароне права і пошуку бясплатных юрыстаў. Звяртайцеся на адрас газеты "Дзвінскі Ўзгорак".

Наша газета стала размяшчацца на партале http://kamunikat.org, дзе зацікаўленыя грамадзяне могуць яе спампаваць яшчэ да з'яўлення газеты на паперы.



ПАЛІТАЛОГІЯ

«ТЫЯ, ХТО ПАДПІСВАЕЦЦА Ў ІНТЭРНЭЦЕ»

Актуальнасць публічных развагаў адзінага палітыка (АП) на тэму незалежнасці і суверэнітэту расце літаральна на вачах. Калі ў тэксце выступлення на ўрачыстым сходзе 2 ліпеня 2018 года слова «незалежнасць» згадвалася 9 разоў, то праз год — 16!



Свет відавочна не становіцца больш бяспечным. Але адкуль варта чакаць чарговую пагрозу? Некалькі разоў уважліва перачытваю тэкст. Пагрозы, як вядома, дзеляцца на знешнія і ўнутраныя. Пра знешнія сказана неяк няпэўна. Цытую: *«За чвэрць стагоддзя сваёй незалежнасці ва ўмовах магутнага палітычнага, інфармацыйнага, эканамічнага ціску (памятаеце, гэта зусім нядаўна было) нам удалося абараніць суверэнітэт, захаваць мір і парадак у краіне, — гэта стала нашай з вамі агульнай перамогай у найноўшай гісторыі. Перамогай без вайны, што вельмі важна».*

Не ведаю, як для чытачоў, але асабіста для мяне ў прыведзенай цытаце ключавым стаў дзеяслоў «было». Я як яго пабачыў — так ад сэрца адлягло. Падумаць толькі, чвэрць стагоддзя трымацца адначасова пад уздзеяннем трох прэсаў: палітычнага, інфармацыйнага і эканамічнага! Аднак мы выстаялі! Усе гэтыя жахі з кашмарнай цяпершчыны засталіся ў мінулым. Адразу і не згадаеш, якому яшчэ народу давялося перажыць такое.

Аднак не варта расслабляцца. Перамога над знешнім, так да канца і не апазнаным праціўнікам, не вызваляе нас ад абавязку *«сачыць за тым, што адбываецца ў краіне».*

Але беларусам пашанцавала. Нездарма ж будаўніцтва беларускай дзяржаўнасці пачалося з узвядзення ўладнай вертыкалі. З яе вяршыні і атрымалася заўважыць *«некалькі тэмаў, якія бурна абмяркоўваюцца»*. І дзе б вы думалі? Ну, вядома, у інтэрнэце — у нашай вялікай «сметніцы».

Дазволю сабе яшчэ адну цытату: *«І вось я апошнім часам заўважыў некалькі тэмаў, якія бурна абмяркоўваюцца. І яны, канешне ж, тычацца перш за ўсё вас. Не сялян, не працоўных, не лекараў, настаўнікаў, нашай інтэлігенцыі, якія працуюць кожны дзень. Нас — эліты, якая кіруе дзяржавай. Разгарнулася бурная палеміка: як будзем служыць у войску? Чытай — як будзем абараняць сваю зямлю, сваю Айчыну?»*

Мяркую, з першага разу не кожны зможа зразумець сэнс цытаты. Яе аўтар падзяліў беларусаў на тых, *«якія працуюць кожны дзень»*, і *«нас — эліты, якая кіруе дзяржавай»*. Нічога арыгінальнага ў гэтым няма. Шматлікія тэорыі элітаў займаюць далёка не апошняе месца ў гуманітарных навуках.

Але чаму пытанні *«як будзем служыць у войску?»* і *«як будзем абараняць сваю зямлю?»* датычацца, перш за ўсё, «вас», г. зн. «нас — эліты»? Ці азначае гэта, што служыць у войску будуць выключна прадстаўнікі «вас-нас-эліты», ці гаворка ідзе толькі пра тое, як будуць служыць тыя, «якія працуюць кожны дзень»?

Тут ёсць над чым паламаць галаву. Свой жа варыянт адказу я прапаную ў канцы гэтай «Азбукі паліталогіі».

«Вас-нас-эліта»

Падчас разграбання «сметніцы» АП зрабіў адкрыццё ў сацыялогіі. Ці зможа яно прэтэндаваць на ролю аналага жамчужнага зерня з байкі Крылова — пакажа час. У цяперашні ж момант даводзіцца канстатаваць, што з адзінага і згуртаванага беларускага грамадства ўпершыню атрымалася вылучыць асобную групу, што супрацьпастаўляе сябе грамадству. Імя гэтай групы — «тыя, хто падпісаўся ў інтэрнэце».

Удзельнікі групы, якая яшчэ не паспела выразна сфарміравацца, ужо адзначыліся некалькімі дзеяннямі. У прыватнасці, патапталі ўздоўж і папярок «беднага Раўкова» (міністра абароны), уся віна якога палягала толькі ў тым, што ён не тое прапанаваў на разгляд парламента.

Важнае тлумачэнне: «тыя, хто падпісаўся ў інтэрнэце», да нас не з Марса прыляцелі і не былі таемна закінутыя з радзімы вынаходнікаў сусветнага павуціння (ЗША). З вяршыні ўладнай вертыкалі ўдалося разгледзець, што касцяк «падпісантаў» складаюць тыя, «хто, перш за ўсё, турбаваўся пра суверэнітэт і незалежнасць». Але адна справа — дбаць з дапамогай падпісання (ад жадаючых тут не адбіцца), і зусім іншае — выконваць свой патрыятычны абавязак.

«Суверэнітэт і незалежнасць — гэта самыя дарагія рэчы». АП пра гэта не стамляецца паўтараць. Што ж нам прапануюць «тыя, хто падпісваецца»? Іх прапановы зводзяцца да своеасаблівага падзелу працы. Прыводжу яго ў выкладанні АП: *«Адны — рабочыя і сяляне, як звычайна, у каго наогул жа ўлады няма, — яны будуць абараняць нас, мы ім дадзім стрэльбы, і хай там паміраюць, абараняючы нас. А мы, вядома, за мяжой ці яшчэ дзесьці будзем атрымліваць адукацыю і будзем выбіраць, дзе нам жыць і працаваць, але абараняць мы не будзем, ваяваць мы не будзем».*

У прыведзенай цытаце тых, хто хаваецца за займеннікамі «нас», «нам» і «мы», не варта блытаць з «вас-нас-элітамі», нягледзячы на тое, што АП надзяліў усю гэтую кампанію правам раздаваць стрэльбы. Мяркую, з нагоды раздачы стрэльбаў АП пагарачыўся. Тым не менш, ідэю наконт падзелу працы ён перадаў правільна…

Дзвюм волям у адным бярлогу не ўжыцца

Які ж з неаднаразова апрабаваных у гісторыі варыянтаў прапануе сёння АП? Старажытнагрэчаскі варыянт адпадае адразу. Ён патрабуе дэмакратыі. Айчынны вопыт падліку галасоў такой форме палітычнага ладу наўрад ці б паспрыяў. Да таго ж у Афінах класічнага перыяду (V стагоддзе да нашай эры) большасць службовых асоб і чальцы калегіяльных органаў кіравання выбіраліся паводле лёсавання.

Старажытныя грэкі лічылі, што такім чынам выяўляецца воля багоў. Але так званая «моцная дзяржава» ў Беларусі ёсць механізм рэалізацыі волі аднаго канкрэтнага чалавека. Дзвюм волям, падобна двум мядзведзям у адным бярлогу, не ўжыцца. Любая няпэўнасць, непазбежная пры лёсаванні, разбурыць стабільнасць. Да такой жа жалю вартай сітуацыі прывядуць і выбары, калі іх вынікі не будуць прадказальныя. Таму выбары ў Беларусі — гэта іспыт. Яго здае ўладная вертыкаль камісіі, уладнай вертыкаллю і сфарміраванай.

Пра пагрозу нявызначанасці, якую спараджаюць «тыя, хто падпісваўся ў інтэрнэце», і папярэджваў АП 2 ліпеня на ўрачыстым сходзе да Дня Незалежнасці. Але панікаваць не трэба. І тым, «якія працуюць кожны дзень», і шчаслівчыкам з ліку «вас-нас-эліты» АП даходліва растлумачыў: *«Гэта мая праблема. Я яе буду вырашаць. Я апошнім часам крыху адцягнуўся ад звычайных спраў (ведаеце чаму, уся краіна гэтай падзеяй жыла, я таксама быў недалёка)»…*

* * *

Час падвесці рысу. І ў XXI стагоддзі неабходнасць абараняць дзяржаўную незалежнасць і суверэнітэт ніхто не адмяняў. Але адкуль сёння выходзяць пагрозы? Ад правільнага адказу на гэтае пытанне залежыць многае, калі не ўсё.

АП, што разважае катэгорыямі мінулага, спрабуе паставіць пад ружжо ўсё мужчынскае насельніцтва краіны. Гэтым жа шляхам імкнуліся ісці бацькі-заснавальнікі СССР. Вынік вядомы. Самая шматлікая армія ў свеце практычна без адзінага стрэлу капітулявала перад масавым жаданнем «чалавека савецкага» спажываць. Крылатым і іншым ракетам не было чаго супрацьпаставіць супермаркетам і Макдональдсам.

(скарочана)

Сяргей Нікалюк
"Новы Час"

АДЗІНЫ ПАЛІТЫК

ЧАМУ ЛУКАШЭНКА НЕ СЬВЯТКАВАЎ СВАЁ 25-ГОДЗЬДЗЕ?

Ці заўважыла палітызаваная публіка дзіўны парадокс: 25-годзьдзе кіраваньня Аляксандра Лукашэнкі адзначылі толькі недзяржаўныя мэдыі? На афіцыйным узроўні, у дзяржаўных СМІ гэтая дата практычна ніяк ня ўзгадвалася, ня кажучы ўжо пра тое, каб урачыста яе сьвяткаваць.

Адмова ад сьвяткаваньня юбілею выглядае вельмі дзіўна, асабліва на тле ідэалягічнага міту, які шмат гадоў улады навязваюць грамадзтву і паводле якога сапраўдным пачаткам беларускай гісторыі абвяшчаецца 1994 год. Гэтая ідэя закладзеная ў Музэі сучаснай беларускай дзяржаўнасьці. На сайце газэты «Беларусь сегодня» ёсьць рубрыка «25.by Чвэрць стагодзьдзя беларускай дзяржаўнасьці». Сам Лукашэнка шмат разоў апавядаў, як ён уратаваў Беларусь, якая нібыта гібела на пачатку 1990-х гадоў.

Для падтрыманьня гэтага міту штучна прыніжаюцца іншыя знакавыя падзеі багатай беларускай гісторыі. Улады нават змазалі, рэдукавалі, спусьцілі на тармазах маштабнае сьвяткаваньне 100-годзьдзя БССР. Паціху абясцэньваюцца нацыянальныя героі. Дайшло і да Кастуся Каліноўскага, якога дзяржаўныя мэдыі пачалі называць польскім дзеячом. І ўсё гэта дзеля таго, каб расчысьціць глебу для іншага героя, якому не патрэбныя канкурэнты.

Таму здавалася, што ў ліпені краіну чакае ўсенароднае сьвята. 25 год кіраваньня, чвэрць стагодзьдзя. Наступны юбілей будзе праз пяць гадоў. Ніхто ня ведае, што можа адбыцца за гэты час. Таму цяпер самы раз было сьвяткаваць.

І на пачатку году ўлады распачалі адпаведную палітычную кампанію. Вось у газэце «Беларусь сегодня» зьявілася ўзгаданая вышэй рубрыка, дзе друкаваліся на дзьвюх палосах матэрыялы, прысьвечаныя «слаўным» 25 гадам. Аналягічныя праекты пачалі рэалізоўвацца на тэлеканалах.

Аднак праз пэўны час гэтую кампанію спынілі. І сам юбілей прайшоў практычна не заўважаны дзяржаўнымі мэдыямі. Калі б не незалежныя СМІ, то грамадзтва б увогуле прапусьціла гэтую дату.

Чаму Лукашэнка не захацеў наладзіць сабе яшчэ адно сьвята? На мой погляд, існуюць некалькі прычын такога рашэньня.

Найперш, варта адзначыць, што кіраўнік Беларусі вельмі асьцярожна ставіцца да свайго культу. У яго пакуль хапае здаровага сэнсу не чапляць на сябе ордэны і мэдалі, не будаваць помнікаў, ня ўпісваць сваё імя ў Канстытуцыю, як гэта робяць дыктатары ў некаторых усходніх краінах.

Мяркую, Лукашэнка добра памятае сумны досьвед Леаніда Брэжнева, які любіў чапляць на сябе іканастас з ордэнаў, урачыста сьвяткаваць розныя юбілеі. Ужо зусім нямогламу генсеку, які зь цяжкасьцю мог гаварыць, савецкія мэдыі нястрымна пялі хвалу, называлі яго «выбітным дзяржаўным дзеячам». Кантраст паміж тым, што народ бачыў па ТБ, і прапагандай быў такі вялізны, што людзі пляваліся і расказвалі анэкдоты.

А галоўная прычына ў тым, што няма чым хваліцца. Пяцігадовы плян правалены. У большасьці грамадзтва ёсьць вялікае расчараваньне, псыхалягічнае адчуваньне тупіку, безнадзейнасьці, адсутнасьці пэрспэктыў. Давер да ўлады і, у прыватнасьці, да самога Лукашэнкі моцна ўпаў. Мабыць, ён ведае вынікі сацыялягічных дасьледаваньняў, таму ня мае ніякіх ілюзій наконт сваёй папулярнасьці. 11 чэрвеня, выступаючы перад чыноўнікамі, ён заявіў: «Я разумею, і вы разумееце, што ўжо не памірае народ ад любові да нас». Таму на гэтым тле Лукашэнка разважліва вырашыў, што ня варта лішні раз нагадваць народу пра тое, як доўга ён кіруе краінай, каб не раздражняць людзей.

Думаю, адыгралі пэўную ролю ўкраінскія выбары (прэзыдэнцкія і парлямэнцкія). Беларусы нечакана вельмі моцна ў іх заангажаваліся. Паводле маіх уласных назіраньняў, далёкія звычайна ад палітыкі людзі раптам пачалі азартна заўзець за ўкраінскіх палітыкаў. Украінскія выбары палітызавалі беларусаў. Беларускае грамадзтва ўразіў той энтузіязм, зь якім суседзі выбралі Ўладзіміра Зяленскага

(працяг на стр. 3)

АДЗІНЫ ПАЛІТЫК

(пачатак на стар. №3)

новым прэзыдэнтам, пракаціўшы старых палітыкаў, у тым ліку дзейнага на той час кіраўніка дзяржавы Пятра Парашэнку. Аказваецца, так можна! Вялікі спадзеў на новых людзей у кіраўніцтве захапіў і беларусаў. Невыпадкова беларускія тэлеканалы старанна пераконваюць, што, маўляў, чым больш дэмакратыі ва Украіне, тым горш украінцы жывуць. Тым ня менш Лукашэнка, мусіць, вырашыў, што на гэтай хвалі нагадваць пра сваё нязьменныя 25 гадоў будзе недарэчы.

І апошні чыньнік — адносіны з Расеяй. Тут таксама няма чым хваліцца. Магчыма, надыходзіць самы цяжкі пэрыяд беларуска-расейскіх дачыненьняў. Верагодна, сам Лукашэнка ведае нешта такое, чаго ня ведаем мы. І гэтая праўда вельмі непрыемная. Кіраўнік Беларусі страчвае вобраз адзінага і нязьменнага чалавека, які можа дамовіцца з Крамлём пра расейскія датацыі. Таму цяпер — не да сьвята.

Валер Карбалевіч
https://www.svaboda.org

РЫНАК ПРАЦЫ

РЕКОРД ЗА РЕКОРДОМ

Количество вакансий в республиканской базе бьет рекорды каждый день. Если в начале этой недели их было чуть больше 93 тысяч, то 12 июля их число превысило отметку в 94 тысячи. При этом в начале июня в базе числилось чуть меньше 90 тысяч вакансий, а в начале мая — чуть больше 80 тысяч. Откуда эти вакансии берутся? FINANCE.TUT.BY адресовал вопрос эксперту.

— Во-первых, наша экономика пусть медленно, но растет. Поэтому неудивительно, что появляются новые вакансии, — говорит Катерина Борнукова, академический директор исследовательского центра BEROC. — Во-вторых, параллельно стареет население, и количество претендентов на эти свободные места уменьшается. А в-третьих, нельзя списывать со счетов то, что набор вакансий в этой базе все равно довольно специфический. В большинстве случаев это низкоквалифицированный труд.

В базе и правда много предложений о работе, которые не требуют каких-то особенных навыков. В пятерке самых востребованных — водители (4,5 тысячи вакансий), продавцы (2,4 тысячи), подсобные рабочие (2,3 тысячи). Хватает предложений для уборщиков (1,8 тысяч), грузчиков (1,1 тысячи), кладовщиков (400). Вдобавок многие из них — на 0,5 ставки или меньше, а больше половины предлагают зарплату до 500 рублей. Так что найти хорошее место через базу вакансий не так уж и просто (хотя бывают исключения).

Число вакансий 12 июля превысило отметку в 94 тысячи

— С другой стороны, это означает, что есть проблема заполнения таких вакансий. Значит, на рынке есть более выгодные предложения, а вакансии с неполной занятостью или низкими зарплатами закрыть достаточно сложно. Это как раз свидетельствует о том, что есть лучшие альтернативы, — комментирует Катерина Борнукова.

Вместе с тем в Беларуси растет не только количество вакансий, но и количество уволенных. Вот уже седьмой месяц подряд работу теряет больше людей, чем находит. Может быть, отсюда и берутся эти свободные места?

— Рост количества уволенных — это скорее какие-то сезонные явления и влияние долгосрочных параметров вроде старения населения и выхода на пенсию большего числа людей. Судя по тому, что вакансии достаточно сильно сконцентрированы в определенных профессиях, они вряд ли связаны с увольнениями, — считает Катерина Борнукова.

При этом отдельную тревогу у специалистов вызывает то, что в пятерке самых востребованных специальностей уже который месяц оказываются врачи (3,4 тысячи вакансий) и медсестры (3,3 тысячи).

— Медицинских профессионалов не хватает в силу того, что их уровень зарплат у нас в стране достаточно низкий. Это достаточно долгосрочный тренд, который прерывался только во время кризиса, когда у людей с медицинскими дипломами не было альтернативных мест для занятости, — говорит Катерина Борнукова. — Безусловно, есть факты отъезда медработников за границу: в Россию, где признаются белорусские дипломы и не требуется никаких дополнительных документов, в ту же Литву, где с радостью ждут наших медицинских специалистов, особенно младших. На самом деле проблема с маленькими зарплатами в медицине проявляется еще на стадии выбора профессии. Молодежь видит зарплату айтишника и зарплату врача и делает достаточно очевидный выбор. Получается, что в итоге в медицинскую профессию идут только те, кто действительно ей предан и хочет спасать жизни людей, а таких не так уж и много.

Власти ранее неоднократно поднимали вопрос трудовой миграции белорусов. К примеру, чтобы удержать уезжающих на заработки медиков, планируют подготовить постановление, по которому можно будет доплачивать отдельным специалистам, работающим в медицине, за специфику труда.

Анна Рыбчинская
FINANCE.TUT.BY

ЦЭНЫ

СРАВНЕНИЕ ПО ЧЕКАМ

Сметана подорожала на 55%. Сравнивать барановичский Intex-press решил не по средним ценам, которые ежемесячно приводит Белстат, а по чекам из местных магазинов. Для чистоты сравнения брали одни и те же товары в одних и тех же магазинах.

Пучок зелени подорожал в 2,5 раза

Больше всего, судя по чекам, за три года подорожали молочные продукты и мясо. К примеру, 200-граммовый пакет сметаны одной и той же марки за это время мало того, что стал на 55% дороже, так и платим мы теперь уже за другой продукт. В июле 2016-го жирность этой сметаны была 28%, а в июле этого года – 25%.

Обычный пучок зелени, который в июле 2016-го можно было купить за 20–30 копеек, подорожал за это время в 2,5 раза! А по той цене, что три года назад продавали самые дорогие помидоры, сегодня продают самый дешевый неликвид.

Зато цена на огурцы мало изменилась: в июле 2016-го за кило просили от 60 копеек до 1 рубля, сейчас – от 60 копеек до 2 рублей.

Без хлеба с батоном

После деноминации цены

Наименование товара	июль 2016	июль 2019	на сколько подорожало,%
Помидоры, 1 кг	2,2	2,79	27
Сметана 28%, 200 г	0,77	1,19	55
Молоко 2,6%, 1 л	0,75	1,09	45
Жевательная резинка	0,71	0,92	30
Йогурт детский, 100 г	0,43	0,49	14
Хлеб	0,95	1,13	19
Курица охлажденная, 1 кг	3,57	4,29	20
Кефир 3,7%, 0,5 л	0,49	0,69	41
Сахар-песок, 1 кг	1,57	1,54	-2
Сыр твердый, 210 г	2,51	2,99	19
Батон	0,94	1,05	12
Фарш куриный, 1 кг	5,98	8,99	50
Зубная паста, 100 г	2,03	2,87	41
Подгузники детские, 48шт.	24,49	28,69	17
Дезодорант мужской, 50 мл	5,49	6,79	24
итого	52,88	65,51	24

Так изменились цены на некоторые товары в барановичских магазинах

Или, например, твердый сыр. В 2016 году он продавался в фасовке по 210 граммов, а сейчас – 200 граммов. Казалось бы, каких-то 10 граммов. Но разница в цене на кило почти 75 копеек.

Но далеко не все продукты подорожали. К примеру, цена на сахар-песок, наоборот, снизилась. И даже без скидок он сегодня стоит пусть немного, но дешевле, чем три года назад.

Подросшие за три года цены в магазинах не идут ни в какое сравнение с ростом цен на овощи и фрукты на рынках.

в Беларуси, по информации официальной статистики, выросли в целом примерно на 17%. Но, считая инфляцию по стране, Белстат берет данные по сотням видов товаров. Одни могут дорожать в несколько раз, а другие дешеветь.

Потребитель же, как правило, покупает намного меньше товаров. Соответственно, его персональная инфляция может отличаться от официальной.

Если в июле 2016 года на 10 рублей мы могли купить курицу, пакет молока и хлеб с батоном, то в июле этого года этой суммы хватит только на курицу и молоко.

https://gazetaby.com

ПАЕЗДКА Ў РЭГІЁН

СТРАННОЕ ОБЩЕНИЕ В ВЕТКЕ

Жители Ветки — Лукашенко: «А на что мы можем жаловаться, если все хорошо?»

Странное общение произошло в Ветковском районе между местными жителями и главой Беларуси. Как сообщает БЕЛТА, возле городского бассейна райцентра Александра Лукашенко ожидали местные жители. Если верить агентству, в толпе раздавались голоса: «Мы вас любим, ценим, уважаем, Александр Григорьевич! Приезжайте к нам почаще!»

Журналисты потом поинтересовались у мужчины, который принимал активное участие в разговоре: «Почему не спрашивали о проблемах, не жаловались?»

– А на что мы можем жаловаться, если все хорошо? Пенсия, зарплата вовремя, в магазинах все есть. Люди на дачах работают, – пояснил Александр, пенсионер, коренной житель Ветки. – Кто хочет работать, тот работает, получает деньги и наслаждается жизнью.

Привело БЕЛТА и слова работницы местного лесхоза Тамары Убоженко: «У нас Ветка, казалось бы, - такой маленький городок, а как замечательно. Только развивайся и живи».

Отметим, что в декабре 2018 года средняя зарплата в Ветковском районе была одной из самых низких в стране – 713 рублей.

Осенью прошлого года Виктор Евмененко, магистр экономических наук, секретарь Беларуского евроатлантического клуба писал на Belarus Security Blog: демографическая ситуация в Ветковском районе весьма печальная, район является глубоко дотационным, частично люди ездят на заработки в Россию, частично в Гомель – в 15 км от райцентра.

https://gazetaby.com

Заснавальнік і рэдактар: Смолікаў Канстанцін Эдуардавіч

Адрас рэдакцыі: г. Віцебск, вул. 1-я Сененская д.5, Тэл. +375-29-218-98-38, e-mail: kas_vit@tut.by
Газета выдаецца з лютага 2014 г.

Падпісана да друку 30.07.2019 у 16.45
Наклад: 290 асобнікаў.
Выдаецца адзін-два разы на месяц на беларускай і расійскай мовах.

Рэдакцыя можа друкаваць артыкулы дзеля палемікі, не падзяляючы пазіцыі аўтараў.
Друкуецца пры падтрымцы аднадумцаў.
Распаўсюджваецца бясплатна дабраахвотнікамі.